## 2025 г. - 20 гадоў з часу стварэння Народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Белый аист» (Кобрын, 2005)



Аматарскае літаратурнае аб'яднанне «Белый аист» было створана ў лістападзе 2005 года па ініцыятыве Васілія Іосіфавіча Паўзуна, урача-афтальмолага і вялікага аматара паэзіі. Эмблемай паэтычнага клуба стаў белы бусел - сімвал Беларусі. З лістапада 2009 года клуб «Белый аист» пачаў дзейнічаць пры Кобрынскім Палацы культуры, што адкрыла новыя перспектывы ў рабоце.

Значныя перамены адбыліся ў клубе з прыходам у 2010 годзе на пасаду кіраўніка літаратурнага аб’яднання Людмілы Іванаўны Лазюк, філолага па адукацыі, настаўніка вышэйшай катэгорыі. Таленавітаму кіраўніку ўдалося аб'яднаць людзей розных узростаў, прафесій, поглядаў, якіх зблізіае любоў да літаратурнай творчасці і жаданне падзяліцца багаццем сваёй творчай натуры. Праца вялася ў трох напрамках: садзейнічанне творчаму росту аўтараў і выканаўцаў, раскрыццё новых здольнасцей, культурна-асветніцкая работа. Важнай падзеяй для літаратурнага клуба стаў выхад у свет першага зборніка прозы і лірыкі аўтараў Кобрыншчыны «Вдохновение» (2010).

За дасягнутыя поспехі ў развіцці аматарскай творчасці, якая адпавядае мастацкаму ўзроўню і творчым паказчыкам, папулярызацыі нацыянальных культурных каштоўнасцей і актыўную канцэртную дзейнасць аб’яднанню ў красавіку 2014 года прысвоена ганаровае найменне «народны аматарскі калектыў». За новым статусам – актыўная канцэртная дзейнасць, выхад у свет аўтарскіх і калектыўных зборнікаў, выставы. Вынікам творчасці сталі выдадзеныя кнігі: калектыўныя зборнікі лірыкі і прозы «Свет Великой Победы» (2015), «Под крылом «Белого аиста» (2015), «Зямля бацькоў дае натхненне» (2017), «Война. Победа. Память» (2020), «И льётся с небес вдохновенье» (2020), «Гимн любви» (2024), а таксама больш за 40 аўтарскіх кніг, складальнікам, рэдактарам і карэктарам большасці з якіх была Л. І. Лазюк.

У верасні 2019 года аб’яднанне ўзначаліла Галіна Андрэеўна Балахоўская, настаўнік беларускай мовы і літаратуры. Кобрынскія паэты заўсёды вызначаліся актыўнай жыццёвай пазіцыяй і неабыякавасцю да ўсяго, што

адбываецца. Іх плённая дзейнасць на карысць роднага краю была ацэнена,і ужо тройчы яны пацвердзілі найменне «народны калектыў».

З 2024 года народнае аматарскае аб’яднанне змяніла назву, цяпер гэта народная літаратурна-паэтычная студыя «Белый аист». Кіраўніцтва літаратурна-паэтычнай студыяй, якая на цяперашні час налічвае 33 удзельнікі, ажыццяўляюць Васілій Ярмашук і Наталля Нікалайчук.

Для папулярызацыі мастацкага слова кобрынскія паэты выкарыстоўваюць разнастайныя формы: літаратурныя чытанні, гульні, гасцёўні, творчыя майстэрні, сустрэчы. Удзельнікамі студыі вядуцца заняткі школы маладога паэта, праводзяцца майстар-класы, арганізоўваюцца масты сяброўства і творчасці з аматарскімі літаратурнымі і бардаўскімі клубамі іншых гарадоў. Штогод збіраюцца на калядныя чытанні, на мерапрыемствы, прысвечаныя Дню ведаў, Дню беларускага пісьменства, Дню беларускай мовы, Сусветнаму дню паэзіі, прымаюць удзел у дабрачынных акцыях.

Вершы ўдзельнікаў «Белого аиста» друкуюцца ў газетах «Кобрынскі веснік», «Заря», «Друг пенсионера», «Духовный вестник», «Літаратура і мастацтва»; не раз друкаваліся на старонках беларуска-ўкраінскага часопіса «Справа». Зборнік вершаў і казак Марыі Кірылюк і Зоі Майстровіч быў выдадзены ў Польшчы. Надзея Момлік, Наталля Цярэнцьева, Міхаіл Кулеш з’яўляюцца членамі Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў.

На словы паэтаў напісана каля 50 песень у супрацоўніцтве з вядомымі кампазітарамі: Т. Юркевіч (г. Брэст), У. Мяцельскі (г. Пінск), М. Нікіціна (г. Мінск), А. Кірыеўскі (г. Кобрын). Выдадзена два CD-дыскі песень Юрыя Харэвіча і чатыры дыскі песень Мікалая Крывагуза.

Народная літаратурна-паэтычная студыя «Белый аист» не толькі актыўна падтрымлівае творчыя ініцыятывы, але і стварае ўласныя традыцыі. Пад яе эгідай пры непасрэдным удзеле члена калектыву Юрыя Харэвіча з падтрымкай СТАА «ВП Палессе» з 2011 года на Кобрыншчыне праходзіць фестываль бардаўскай песні і паэзіі «Сонечны», які аб’ядноўвае творцаў з розных куткоў Беларусі, Расіі і які заявіў аб сабе як аб значнай культурнай падзеі Брэстчыны. Фестываль традыцыйна праводзіцца з мэтай падтрымкі і развіцця жанру бардаўскай песні, раскрыцця новых творчых

імёнаў, аказання дапамогі творчаму росту аўтараў і выканаўцаў песень.

Значную ўвагу ўдзельнікі літаратурна-паэтычна студыі надаюць літаратурнаму краязнаўству: наладжаны цесныя творчыя адносіны з ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», падтрымліваецца сувязь з агульнаадукацыйнымі і прафесіянальна-тэхнічнымі ўстановамі горада і раёна.

Таленавітых паэтаў «Белого аиста» ведаюць далёка за межамі раёна. Яны неаднаразова станавіліся пераможцамі конкурсаў абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў. Удзельнікі літаратурна-паэтычнай студыі з вялікім поспехам выступаюць на розных фестывалях і святах, заўсёды прывозяць адтуль шматлікія ўзнагароды. У перспектыве работы студыі «Белый аист» шмат планаў, імкненняў, шмат творчасці.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай
цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Вдохновение** : сборник прозы и лирики Кобринщины / сост. Т. Н. Садовничек. – Брест : Альтернатива, 2010. – Вып. 1. - 336 с.

**Война.** Победа. Память : стихи. – Кобрин : Дворец культуры, 2020. – 68 с.

**Гимн** любви : стихи поэтов народной литературно-поэтической студии "Белый аист" / сост.: Н. Н. Николайчук, В. А. Ярмашук ; ред. М. И. Кулеш. – Кобрин, 2025. – 133 с.

**Зямля** бацькоў дае натхненне : вершы / Народнае аматарскае аб'яднанне "Белый аист" ; [укладальнік і рэдактар Л. І. Лазюк]. - Кобрын : Палац культуры, 2017. - 75, [1] с.

**И льется** с небес вдохновенье : стихи поэтов народного любительского объединения "Белый аист" / [составитель и редактор Л. И. Лазюк]. - Кобрин : Дворец культуры, 2020. – 71 с.

**Под крылом** «Белого аиста» : к 10-летию народного любительского объединения «Белый аист» / сост. и ред. Л. И. Лазюк. – Кобрин, 2015. – 122 с.

**Свет** Великой Победы : стихи и песни поэтов народного любительского объединения «Белый аист» о Великой Отечественной войне / сост. и ред. Л. И. Лазюк. – Кобрин : Дворец культуры, 2015. - 44 с.

**Паэтычны** клуб «Белый аист» // Літаратурная карта Берасцейшчыны. – Брэст, 2008. – С. 313-314.

**Народнае** аматарскае літаратурнае аб'яднанне «Белы бусел» (2005) - 20 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 197.

**Белов, Д.** В каждом слове – боль о войне / Дмитрий Белов ; фото Ирины Омельянчук // Кобрынскі веснік. - 2025. – 17 мая (№ 20). – С. 15.

Накануне Дня Победы состоялась презентация поэтического сборника "Свет Великой Победы" участников "Белого аиста".

**Дубіна, Л**. Белавежская пушча — краю нашага слава! / Людміла Дубіна ; фота з архіва народнага аматарскага аб'яднання "Белы бусел" // Кобрынскі веснік. - 2023. — 7 кастрычніка (№ 62). — С. 15 : фат.

**Дубіна, Л.** "Пад крылом "Белого аиста" / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2023. — 4 лістапада (№ 66). — С. 20 : фат.

Пра дзейнасць народнага аматарскага аб'яднання "Белый аист".

**Дубіна, Л**. Гучы, роднае слова! / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2022. — 28 верасня (№ 74). — С. 8 : фат.

У сярэдняй школе № 3 г. Кобрына прайшоў тыдзень беларускай мовы з удзелам членаў народнага аматарскага аб'яднання "Белы бусел".

**Дубіна, Л.** Свяціў усім сваім святлом... / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2022. — 5 кастрычніка (№ 76). — С. 8 : фат.

Пра паэта, кампазітара, члена літаратурнага аб'яднання "Белы бусел" Мікалая Крывагуза, які нядаўна пайшоў з жыцця.

**Кандрашук, Н. П**. Пушчанская музыка восені / Наталля Кандрашук // Літаратура і мастацтва. - 2022. — 21 кастрычніка (№ 42). — С. 3.

Удзельнікі літаратурных клубаў "Белы бусел" і "ПаэтыКо" прымалі ўдзел у Першым фестывалі бардаўскай песні і паэзіі.

**Бакун, А.** Чалавеку патрэбна слова... / Алена Бакун ; фота з архіва аб'яднання // Кобрынскі веснік. - 2021. — 8 мая (№№ 36—37). — С. 15 : фат.

Пра народнае аматарскае аб'яднанне "Белый аист".

**Бакун, А**. Пад крыламі творчасці / Алена Бакун ; фота з архіва аб’яднання // Кобрынскі веснік. – 2020. – 9 снежня (№ 95). – С. 8 : фат.

Пра народнае аматарскае аб'яднанне "Белый аист".

**Елизарова, Ж.** Под крылом "Белого аиста" / Жанна Елизарова ; фото из архива народного любительского объединения "Белый аист" // Кобрынскі веснік. - 2021. — 23 чэрвеня (№ 49). — С. 8 : фот.

О работе народного любительского объединения "Белый аист" Кобринского Дворца культуры.

**Дубіна, Л**. Які ж прыгожы гэты свет! / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2020. — 26 лютага (№ 15). – С. 8 : фат.

Удзельнікі народнага аматарскага аб'яднання "Белы бусел" прынялі ўдзел у прамым эфіры перадачы Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё.

**Савчук, М.** Поэзия — чудесная страна / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. — 25 июня (№ 26). — С. 4 : фот.

15 лет в г. Кобрине успешно функционирует народное любительское объединение "Белый аист".

**Дубина, Л**. "Солнечный" собрал друзей / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2019. — 22 чэрвеня. — С. 12 : фот.

Состоялся VIII открытый фестиваль бардовской песни и поэзии "Солнечный", инициаторами которого являются и члены объединения "Белый аист".

**Савчук, М**. И в каждой строчке вдохновенье / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. — 21 марта (№ 12). — С. 4.

Истинные ценители поэзии составляют основной костяк народного любительского объединения "Белый аист".

**Пальто, К.** Каб свет паэзіі пазнаць ... / Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. - 2019. — 2 сакавіка. — С. 9.

Удзельнікі народнага аматарскага аб'яднання "Белы бусел" святкавалі Дзень роднай мовы.

**Дубіна, Л.** Вялікі патэнцыял кобрынскіх паэтаў / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2018. — 5 мая. — С. 15.

Вершы кобрынскіх паэтаў народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел» увайшлі ў дзявяты нумар літаратурнага альманаха «Жырандоля».

**Дубіна, Л.** I гучала гітара ... / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2017. — 28 чэрвеня. — С. 3.

Адбыўся фестываль бардаўскай песні і паэзіі "Сонечны".

**Дубіна, Л.** Пакуль гучаць паэзіі хвалюючай радкі / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2017. — 16 снежня. — С. 4.

Удзельнікі народнага аматарскага аб'яднання "Белы бусел" ахвотна адклікаюцца на сустрэчы з моладдзю.

**Дубіна, Л**. Творчыя і ... народныя / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2017. — 8 лютага. — С. 8.

Народнае аматарскае аб`яднанне "Белы бусел" прадставіла творчую справаздачу.

**Пальто, К.** Прайшліся шляхамі Скарыны / Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. — 9 верасня. — С. 3.

Члены народнага аматарскага аб'яднання "Белы бусел" арганізавалі гісторыка-літаратурнае падарожжа "Шляхамі Францыска Скарыны: 500-годдзе беларускага кнігадрукавання".

**Дубіна, Л.** Гучы, роднае слова! / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. — 24 лютага. — С. 8.

Да Міжнароднага дня роднай мовы удзельнікі народнага аматарскага аб`яднання "Белы бусел" правялі літаратурна-музычную гасцёўню "Гімн роднай мове".

**Дубина, Л.** Поэтический свет Рождества / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. — 6 студзеня. — С. 2.

Организаторами мероприятия к Рождеству Христову выступили члены любительского объединения "Белый аист".

**Солнечная** струна // Вечерний Брест. - 2016. — 29 июня. — С. 6.

Прошел V городской фестиваль авторской песни "Солнечный", организатором выступил исполнитель авторской песни, участник народного любительского объединения "Белы бусел" Ю. Харевич.

**Дубіна, Л**. Пад крыламі "Белага бусла" / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2015. — 9 снежня. — С. 8.

Народнае літаратурнае аматарскае аб'яднанне "Белы бусел" адзначыла сваё 10-годдзе.

**Дубина, Л.** "Белый аист" стал "народным" / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2015. — 1 студзеня. — С. 5.

В 2014 году сообществу кобринских поэтов было присвоено звание народного.

**Дубіна, Л.** Слова роднае люблю / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2015. — 11 сакавіка. — С. 8.

Літаратурная гасцёўня, праведзеная ў абласной бібліятэцы і прысвечаная роднай мове, адбылася з удзелам аматарскага аб'яднання "Белы бусел".

**Казакова, А.** Поэзия войны священна / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. — 26 марта. — С. 3.

Литературное объединение "Белый аист" организовало поэтический вечер "Поэзия войны священна" для школьников города.

**Гром, А.** И "Вдохновенья" час настал / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2010. - 14 жніўня. - С. 12.

О сборнике поэтов "Белого аиста".

**Гром, А.** Презентация "Вдохновения" / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2010. - 2 кастрычніка. - С. 12.

**Елизарова, Ж.** "Служенье муз не терпит суеты"... / Жанна Елизарова // Кобрин-информ. - 2010. - 18 ноября. - С. 3.

Кобринскому литературно-поэтическому клубу «Белый аист» исполнилось пять лет.

**Кандрашук, Н**. З-пад пяра / Наталля Кандрашук // ЛіМ. - 2010. - 1 кастрычніка. - С. 3.

“Натхненне” – так называецца зборнік прозы і лірыкі Кобрыншчыны.

**Сацук, Т**. Поэтический взлёт "Белого аиста" / Татьяна Сацук // Кобрин-информ. - 2007. - 5 июля. - С. 7.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Кобрын

***Установы:***

Кобрынская літаратурная студыя «Белый аист»

***Прадметы:***

Паэты
Літаратурныя аб’яднанні
Аматарскія аб’яднанні